УДК 81’37(045)

# Маніфестацыя калектыўнага падсвядомага ў беларускай фатычнай камунікацыі

Мартысюк Н.П.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Міжасобасны мікраўзровень камунікацыі кожнай нацыянальнай культуры адлюстроўвае самыя глыбінныя працэсы камунікавання і стварае ўласна канвенцыянальны элемент культуры: культурныя веды на кожным этапе развіцця грамадства падсвядома і сінтэтычна (кагнітыўна-падсвядома, па М. Мінскаму) падзяляюцца ўсімі, а значыць, утвараюць семантычныя інтэнцыянальныя рэгулятывы, якія транслююць інфармацыю псіхічнага свету ўсяго моўнага калектыву, напрыклад, інфармацыю радавога, нацыянальнага, або сацыяльнага планаў.

На ўзроўні індывідуальнага падсвядомага семантычныя інтэнцыянальныя рэгулятывы пераламляюцца праз інфармацыю псіхічнага свету пэўнага чалавека, але ўжо на ўзроўні свядомага актуалізуюцца ў маўленні у выглядзе стэрэатыпаў маўленчых паводзінаў. Па нашых папярэдніх даных, у беларускай фатычнай камунікацыі самым частотным інтэнцыянальным рэгулятывам з’яўляецца семантыка смерці. Смерць у беларускім маўленчым калектыве яшчэ з дахрысціянскіх часоў асацыюецца з пераходам у новы этап жыцця, якога не трэба баяцца, але да якога трэба быць падрыхтаваным. Таму і рэакцыя беларускага суразмоўцы на адпаведную рэпліку заўсёды будзе станоўчай (у адрозненне ад суразмоўцы украінца, армяніна ці грузіна). Напрыклад:

(1) (у якасці пралангацыі маўленчага акту) *А твая матка яшчэ не памерла? – Не, хварэе. – А чаму?*

(2) (у якасці прывітання) *Як? Ты яшчэ жывы? Ты ж цяжка хварэў? Я думаў ты памёр даўно! – Як бачыш не. Соўваюся патроху. Во на работу еду.*

(3) (у якасці заканчэння маўленчага акту) *Так, так ... Ну, добра ... А ты заходзіла да Марысі? – Усё добра, канае патроху. – Ну, будзь тады.*

Як бачна, беларускае фатычнае ўзаемадзеянне з семантыкай смерці накіравана на ўсталяванне псіхалагічнага кантакту, паразумення. Яно ўяўляе з сябе ўздзеянне, якое выяўляецца ў супадзенні і несупадзенні семантычных кодаў гаворачых асоб і якое дэтэрмінуе той ці іншы вынік камунікацыі, адводзячы камунікаванню месца элемента ў структуры супольнай дзейнасці.